**Зацвярджаю**
Намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________А.У.Кадлубай
“9” 03 2023

**Праграма**
**уступнага іспыту па дысцыпліне “Творчасць”**
(для абітурыентаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якія паступаюць на спецыяльнасць 6-05-0321-01 “Журналістыка”)

## I. Агульныя ўказанні

Журналістыка – сфера дзейнасці, звязаная са зборам, апрацоўкай, аналізам і распаўсюджваннем інфармацыі з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі (прэса, тэле- і радыёвяшчанне, сеткавыя выданні і інш.). Прафесія журналіста з’яўляецца надзвычай запатрабаванай, бо значнасць СМІ ў інфармацыйным грамадстве ўзрастае. СМІ выступаюць адначасова як інструмент фарміравання грамадскай думкі і як сродак яе выражэння, прастора для дыялогу і пошуку паразумення паміж рознымі сацыяльнымі групамі. Прафесійны журналіст мае шырокі кругагляд і валодае дастатковымі творчымі здольнасцямі і тэхналагічнымі навыкамі, каб ствараць запатрабаваны масавай аўдыторыяй інфармацыйны прадукт.

Абітурыенты факультэта журналістыкі БДУ, якія паступаюць у 2023 г. на спецыяльнасць “Журналістыка”, здаюць уступны іспыт “Творчасць”.

Мэта іспыту заключаецца ў вызначэнні наяўнасці ў абітурыентаў творчых здольнасцяў, схільнасці да прафесійнай журналісцкай дзейнасці, аналітычнага мыслення, умення даваць ацэнку падзеям і з’явам, а таксама ўяўленняў аб функцыянаванні сродкаў масавай інфармацыі.

## II. Патрабаванні да профільнага ўступнага іспыту

Іспыт “Творчасць” праводзіцца ў два этапы: I этап – творчае сачыненне, II этап – творчае тэсціраванне ў форме субяседавання.

2.1 Першы этап – **творчае сачыненне**. Абітурыенты пішуць яго на працягу 240 хвілін. Аб’ём – да чатырох старонак. Тэматыка творчых сачыненняў фарміруецца на аснове надзённых з’яў духоўна-маральнага і сацыяльнага жыцця грамадства. Абітурыентам прапануюцца на выбар па тры тэмы на рускай і беларускай мовах.

Прыкладныя тэмы сачыненняў:

*Варыянт 1*

*1. Журналіст у адказе за слова…*
*2. Ты кажаш, я не ведаю вайны… (Н. Гілевіч).*
*3. Мой дом – мая краіна.*

***

*1. Обращаться со словами надо честно (Н. Гоголь).*
*2. Память вечная о тех, кто погиб.*
*3. Охранять природу – значит любить Родину.*

Адзнака выстаўляецца за змест, маўленчае афармленне і пісьменнасць (арфаграфія, пунктуацыя, граматыка).

Асноўнымі крытэрыямі пры ацэнцы зместу сачынення з’яўляюцца наступныя:

- асвятленне тэмы з аналізам фактаў рэчаіснасці;
- уменне адбіраць факты, вылучаць істотнае;
- сістэмнасць, паслядоўнасць, лагічнасць выкладу, аргументаванасць вывадаў і абагульненняў;
- лексічнае багацце, выразнасць і вобразнасць мовы;
- арыгінальнасць, творчая індывідуальнасць абітурыента.

2.2 Другі этап творчага іспыту – **вусны экзамен**, які праходзіць у форме субяседавання і ўключае:

1. Аналіз творчых работ абітурыента (публікацыі ў газетах і часопісах, інтэрнэт-выданнях, сцэнарыі, тэксты сюжэтаў тэле- і радыёперадач, што выйшлі ў эфір і г. д.);
2. Адказ на пытанні па тэмах, звязаных з камунікатыўнай дзейнасцю, журналісцкай і літаратурнай практыкай у межах агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі абітурыента;
3. Выкананне пісьмовага задання (моўны аналіз і праўка беларускамоўных і рускамоўных тэкстаў).

Прыкладны білет:

***Экзаменацыйны білет № 1***

*для ўступнага іспыту па творчым тэсціраванні*

*1. Аналіз творчых работ.*
*2. Маладзёжныя выданні Беларусі.*
*3. Пісьмовае заданне.*

Творчыя работы (публікацыі ў газетах і часопісах, у сеткавых выданнях, сцэнарыі, тэксты сюжэтаў тэле- і радыёперадач, што выйшлі ў эфір і г.д.) падаюцца абітурыентам у прыёмную камісію непасрэдна перад уступным іспытам. Калі абітурыент не можа прадставіць арыгіналы публікацый, тады іх копіі, а таксама копіі сцэнарыяў, тэкстаў сюжэтаў тэле- і радыёперадач павінны быць завераны адказнымі асобамі выданняў, з якімі супрацоўнічаў абітурыент, і пячаткай установы. Ацэнка прадстаўленых абітурыентам у прыёмную камісію творчых работ залежыць ад іх якасці і тэрміну публікацыі або выхаду ў эфір.

Да публікацый у СМІ прыраўноўваюцца матэрыялы, апублікаваныя ў

адпаведнасці з устаноўленым парадкам на творчых пляцоўках факультэта журналістыкі (газета “Журфакты”, парталы Websmi.by, Studlive.by).

Умоўна тэмы гутаркі на субяседаванні могуць быць падзелены на блокі, якія ўключаюць грамадска-палітычную і эканамічную праблематыку, пытанні культурнага жыцця, міжнародных адносін, спецыфіку работы журналіста ў перыядычных выданнях, у аўдыявізуальных сродках масавай інфармацыі і ў інтэрнэт-прасторы. Абітурыенту будзе прапанавана адказаць на шэраг пытанняў агульнапрафесійнага напрамку, якія, з аднаго боку, дазваляюць паказаць веды па праграмах дысцыплін гуманітарнага профілю ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, а з другога – даюць магчымасць весці субяседаванне, падчас якога павінен выявіцца характар творчай асобы атэстуемага.

### Прыкладны пералік пытанняў для субяседавання

1. Нацыянальная і інфармацыйная бяспека Рэспублікі Беларусь.
2. Асноўныя прыярытэты эканамічнай, сацыяльнай і культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.
3. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь: адлюстраванне ў СМІ.
4. Дзяржаўная інфармацыйная палітыка Рэспублікі Беларусь.
5. Дзяржаўная праграма развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства.
6. Актуальныя міравыя праблемы ў навінах інфармацыйных агенцтваў.
7. Журналістыка як від творчай дзейнасці. Функцыі журналістыкі ў грамадстве.
8. Этычнае рэгуляванне журналісцкай дзейнасці і праблема этыкі блогінга.
9. Тэлевяшчанне Рэспублікі Беларусь (характарыстыка асобных тэлевізійных каналаў).
10. Радыёвяшчанне Рэспублікі Беларусь (характарыстыка асобных радыёканалаў).
11. Перыядычныя выданні Рэспублікі Беларусь (характарыстыка рэспубліканскіх і рэгіянальных газет і часопісаў).
12. Інтэрнэт-СМІ Рэспублікі Беларусь (характарыстыка асобных анлайн-пляцовак).
13. Сацыяльныя сеткі і мэсанджары ў працы журналіста.
14. Імідж журналіста: прафесійна-асабістыя характарыстыкі (аналіз творчасці журналіста – на выбар).
15. Асоба ў журналісцкім творы: пошук героя для сучасных медыя.
16. Праблемна-тэматычная палітра беларускіх СМІ.
17. Маладзёжныя і дзіцячыя СМІ і медыяпраекты: традыцыйныя і лічбавыя фарматы.
18. Сучасныя беларускія літаратурна-мастацкія выданні і медыяпраекты.
19. Культурная праблематыка ў СМІ і сацыяльных медыя.
20. Навуковыя выданні Беларусі.

21. Журналістыка і спорт. Буйныя перамогі беларускіх спартсменаў і асноўныя спартыўныя падзеі краіны. Прапаганда здаровага ладу жыцця ў СМІ.

22. Экалагічная праблематыка ў СМІ.

23. Год міра і стварэння ў матэрыялах СМІ Рэспублікі Беларусь.

24. Мова і стыль сродкаў масавай інфармацыі. Асаблівасці публіцыстычнага стылю.

25. Журналістыка і сучасны літаратурны працэс.

26. Медыяпраекты і медыяпляцоўкі БДУ.

Пісьмовае заданне ўключае моўны аналіз і праўку беларускамоўных і рускамоўных тэкстаў. Абітурыент павінен выправіць тэкст, тэарэтычна абгрунтаваўшы праўку знойдзеных памылак (арфаграфічных, граматычных, пунктуацыйных, маўленчых, стылістычных).

## Прыклад пісьмовага задання да білета

### I.

*Кстати, кладезь необычных игрушек и украшений – блошиный рынок. Я еще не разу не ушла от туда без покупки – в разное время преобретала там картины, бижутерию, другие винтажные, эксклюзивные вещи. А еще вканун Нового года я расставляю по квартире фигурки фарфоровых ангелов: предвестников приближающихся любимых праздников Нового года и Рождества.*

**Правильный ответ:**

1) орфографическая ошибка: *н**и** разу; оттуда; пр**и**обретала; в канун;*

2) пунктуационная ошибка:

а) *винтажные эксклюзивные* – неоднородные определения;

б) тире вместо двоеточия в последнем предложении при обособлении приложения.

### II.

*Генпракуратура разам з МВД ініцыявалі прыняцце закона на забарону знахожання непаўналетніх у грамацкіх месцах ноччу. Такія правілы ёсць у некатарых краінах, і названная папраўка няўмольна дыктуецца жыццём. Толькі вось ці будзе яна працаваць. Ёсць у нас забароны на распіванне піва і гарэлкі на вуліцы, на курэнне ў грамацкіх месцах. Але далёка не заўсёды тыя забароны дзейнічаюць.*

**Правільны адказ:**

1) арфаграфічная памылка: *грама**дс**кіх; знахо**дж**ання; назва**н**ая; некат**о**рых;*

2) лексічная памылка: ***МУС*** *– Міністэрства ўнутраных спраў*;

3) граматычная памылка: *закона **аб з**абароне*;

4) пунктуацыйная памылка: *Толькі вось ці будзе яна працаваць?* – пытальны сказ.

Кожная частка творчага тэсціравання ацэньваецца асобна па дзесяцібальнай шкале. Па выніках тэсціравання абітурыенту выстаўляецца сярэдняя адзнака.

Пры выстаўленні канчатковай адзнакі камісія можа ўлічыць:

- удзел абітурыента ў прафесійных журналісцкіх конкурсах. Перавагу маюць лаўрэаты конкурсаў “Дэбют” (ГА “Беларускі саюз журналістаў”), “Залатое пяро «Белай Русі»” (ГАА “Белая Русь”), “Старт” (факультэт журналістыкі БДУ), іншых конкурсаў, арганізаваных партнёрамі факультэта;
- уласныя творчыя праекты абітурыента па-за межамі СМІ, але звязаныя з журналістыкай (выпуск блога, падкаста, адміністраванне і прасоўванне суполкі ў сацыяльных сетках і г. д.);
- удзел у выпуску СМІ ўстановы адукацыі, пацверджаны характарыстыкай кіраўніка дадзенай установы;
- удзел у журналісцкіх гуртках, школах маладога журналіста і г. д.;
- наяўнасць дыпломаў, падзяк, грамат за ўдзел у грамадскім жыцці.

## III. Ацэнка вынікаў профільнага ўступнага іспыту

3.1 Крытэрыі ацэнкі творчага сачынення
(на беларускай мове)

| № п/п | Адзнака ў балах па дзесяцібальнай шкале | Змест | Маўленчае афармленне | Пісьменнасць (колькасць памылак) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | 1 (адзін) | Работа не адпавядае тэме або тэма не раскрыта. Парушаны сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі. Дапушчана больш за 8 недахопаў у змесце | Работа характарызуецца беднасцю слоўніка, кароткімі аднатыпнымі канструкцыямі. Дапушчана больш за 8 маўленчых недахопаў | Больш як на 2 балы |
| 2. | 2 (два) | Работа не адпавядае тэме. Сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі часта парушаюцца. Дапушчана не больш за 8 недахопаў у змесце | Работа характарызуецца беднасцю слоўнікавага запасу, аднатыпнасцю канструкцый. Дапушчана не больш за 8 маўленчых недахопаў | 0/11, 0/10, 1/10, 1/9, 2/9, 2/8, 3/8, 3/7, 4/7, 4/6, 5/6, 5/5, 6/5, 6/4, 7/4, 7/3, 8/3, 8/2, 9/2, 9/1, 10/1, 10/0, 9/0 і да 10 граматычных памылак |
| 3. | 3 (тры) | Работа часткова раскрывае тэму і асноўную думку. Сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі ў некаторых выпадках парушаюцца. Дапушчана не больш за 7 недахопаў у змесце | Работа вызначаецца беднасцю слоўнікавага запасу, аднатыпнасцю канструкцый. Дапушчана не больш за 7 маўленчых недахопаў | 0/8, 0/9, 1/7, 1/8, 2/6, 2/7, 3/5, 3/6, 4/4, 4/5, 5/3, 5/4, 6/3, 6/2, 7/2, 7/1, 7/0, 8/1, 8/0 і да 8 граматычных памылак |
| 4. | 4 (чатыры) | Работа часткова раскрывае тэму і асноўную думку, ёсць адхіленні ад | Работа вызначаецца пэўнай беднасцю слоўнікавага | 0/7, 1/6, 2/5, 3/4, 4/3, 5/2, 6/1, 6/0 і да 6 граматычных памылак |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | тэмы. Сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі ў адзінкавых выпадках парушаюцца. Дапушчана не больш за 6 недахопаў у змесце | запасу і аднатыпнасцю сінтаксічных канструкцый. Дапушчана не больш за 6 маўленчых недахопаў | |
| 5. | 5 (пяць) | Работа ў цэлым раскрывае тэму і асноўную думку, ёсць адхіленні ад тэмы. Вытрымліваецца агульнае сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў і паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі ў цэлым захоўваюцца. Дапушчана не больш за 5 недахопаў у змесце | У рабоце ёсць адзінкавыя выпадкі выкарыстання выяўленчых сродкаў мовы. Дапушчана не больш за 5 маўленчых недахопаў | 0/6, 1/5, 2/4, 3/3, 4/2, 5/0, 5/1 і да 5 граматычных памылак |
| 6. | 6 (шэсць) | Работа ў цэлым раскрывае тэму і асноўную думку, ёсць адхіленні ад тэмы. Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца агульная сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў. Дапушчана не больш | Работа ў цэлым вызначаецца разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю словаўжывання, выразнасцю. Дапушчана не больш за 4 маўленчыя недахопы | 0/5, 1/4, 2/3, 3/2, 4/0, 4/1 і да 4 граматычных памылак |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | за 4 недахопы ў змесце | | |
| 7. | 7 (сем) | Работа раскрывае тэму і асноўную думку. Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца агульная сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў. Дапушчана не больш за 3 недахопы ў змесце | Работа вызначаецца разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю словаўжывання, выразнасцю. Дапускаецца не больш за 3 маўленчыя недахопы | 0/4, 1/3, 2/2, 3/0, 3/1 і да 3 граматычных памылак |
| 8. | 8 (восем) | Работа раскрывае тэму і асноўную думку. Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў. Дапушчана не больш за 2 недахопы ў змесце | Работа характарызуецца багаццем слоўніка, разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю словаўжывання, агульнай лагічнасцю, выразнасцю, стыль работы ў цэлым характарызуецца адзінствам выкарыстання моўных сродкаў. Дапушчана не больш за 2 маўленчыя недахопы | 0/3, 2/0, 2/1, 1/2 і да 2 граматычных памылак |
| 9. | 9 (дзевяць) | Работа цалкам раскрывае тэму і асноўную думку (наяўнасць тэматычнага адзінства). Захоўваецца | Работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, лагічнасцю, | 0/2, 1/0, 1/1, 0/1 або 1-3 выпраўленні на месцы арфаграм (пунктаграм) і не больш за 1 граматычную памылку |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў. Дапушчаны не больш за 1 недахоп у змесце | дакладнасцю словаўжывання, выразнасцю, вызначаецца адзінствам выкарыстання моўных сродкаў. Дапушчаны не больш за 1 маўленчы недахоп | |
| 10. | 10 (дзесяць) | Работа цалкам раскрывае тэму і асноўную думку (наяўнасць тэматычнага адзінства). Захоўваецца паслядоўнасць у развіцці асноўнай думкі, вытрымліваецца сэнсавая цэласнасць у разгортванні асноўнай думкі, сэнсавая сувязь сказаў. Недахопаў у змесце не дапушчана | Работа характарызуецца багаццем слоўніка і разнастайнасцю выкарыстаных моўных сродкаў, дакладнасцю, лагічнасцю, дарэчнасцю, выразнасцю. Маўленчыя недахопы адсутнічаюць | 0/0, 1(нягрубая)/0, 0/1(нягрубая), 1-2 выпраўленні не на месцы арфаграм (пунктаграм) |

## 3.2 Крытэрыі ацэнкі творчага сачынення (на рускай мове)

| № п/п | Отметка в баллах по десятибалль-ной шкале | Содержание | Речевое оформление | Грамотность (количество ошибок) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | 1 (один) | Работа не соответствует теме, или тема не раскрыта. Нарушены смысловая связь предложений и последовательность в развитии основной | Работа отличается бедностью словаря, короткими однотипными конструкциями. Допущено более 8 речевых | Более чем на 2 балла |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | мысли.<br>Допущено более 8 недочетов в содержании | недочетов | |
| 2. | 2<br>(два) | Работа не соответствует теме.<br>Смысловая связь предложений и последовательность в развитии основной мысли часто нарушаются.<br>Допущено не более 8 недочетов в содержании | Работа характеризуется бедностью словаря, однотипностью конструкций.<br>Допущено не более 8 речевых недочетов | 0/11, 0/10, 1/10, 1/9, 2/9, 2/8, 3/8, 3/7, 4/7, 4/6, 5/6, 5/5, 6/5, 6/4, 7/4, 7/3, 8/3, 8/2, 9/2, 9/1, 10/1, 10/0, 9/0 при 0–10 грамматических ошибках |
| 3. | 3<br>(три) | Работа частично раскрывает тему и основную мысль.<br>Смысловая связь предложений и последовательность в развитии основной мысли в ряде случаев нарушаются.<br>Допущено не более 7 недочетов в содержании | Работа отличается бедностью словаря, однотипностью конструкций.<br>Допущено не более 7 речевых недочетов | 0/8, 0/9, 1/7, 1/8, 2/6, 2/7, 3/5, 3/6, 4/4, 4/5, 5/3, 5/4, 6/2, 6/3, 7/1, 7/2, 7/0, 8/1, 8/0<br>при<br>0–8 граммати-ческих ошибках |
| 4. | 4<br>(четыре) | Работа частично раскрывает тему и основную мысль, имеются отклонения от темы.<br>Смысловая связь предложений и последовательность в развитии основной мысли в единичных случаях нарушаются.<br>Допущено не более 6 недочетов в содержании | Работе присуща определенная бедность словаря и однотипность синтаксических конструкций.<br>Допущено не более 6 речевых недочетов | 0/7, 1/6, 2/5, 3/4, 4/3, 5/2, 6/1, 6/0<br>при<br>0–6 граммати-ческих ошибках |
| 5. | 5<br>(пять) | Работа в целом раскрывает тему и основную мысль; имеются отклонения от темы.<br>Выдерживается общая смысловая цельность в | В работе отмечаются случаи использования выразительных средств языка.<br>Допущено не более 5 речевых | 0/6, 1/5, 2/4, 3/3, 4/2, 5/1, 5/0<br>при<br>0–5 граммати-ческих ошибках |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | развертывании основной мысли, смысловая связь предложений и последовательность в развитии основной мысли в целом соблюдаются.<br>Допущено не более 5 недочетов в содержании | недочетов | |
| 6. | 6<br>(шесть) | Работа в целом раскрывает тему и основную мысль, имеются отклонения от темы.<br>Соблюдается последовательность развития мысли, выдерживаются общая смысловая цельность в развертывании основной мысли, смысловая связь предложений.<br>Допущено не более 4 недочетов в содержании | Работа в целом отличается разнообразием используемых языковых средств, точностью словоупотребления, выразительностью.<br>Допущено не более 4 речевых недочетов | 0/5, 1/4, 2/3, 3/2, 4/1, 4/0<br>при<br>0–4 граммати-ческих ошибках |
| 7. | 7<br>(семь) | Работа раскрывает тему и основную мысль.<br>Соблюдается последовательность развития мысли, выдерживаются общая смысловая цельность в развертывании основной мысли, смысловая связь предложений.<br>Допущено не более 3 недочетов в содержании | Работа отличается разнообразием используемых языковых средств, точностью словоупотребления, выразительностью.<br>Допущено не более 3 речевых недочетов, в том числе нарушений стилевого единства текста | 0/4, 1/3, 2/2, 3/1, 3/0<br>при<br>0–3 граммати-ческих ошибках |
| 8. | 8<br>(восемь) | Работа раскрывает тему и основную мысль.<br>Соблюдается последовательность | Работа отличается богатством словаря, разнообразием используемых языковых средств, | 0/3, 1/2, 2/1, 2/0<br>при<br>0-2 граммати-ческих ошибках |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | развития мысли, выдерживаются смысловая цельность в развертывании основной мысли, смысловая связь предложений. Допущено не более 2 недочетов в содержании | точностью, общей логичностью, выразительностью, стиль работы в целом характеризуется единством использования языковых средств. Допущено не более 2 речевых недочетов | |
| 9. | 9 (девять) | Работа полностью раскрывает тему и основную мысль (наличие тематического единства). Соблюдается последовательность развития мысли, выдерживаются смысловая цельность в развертывании основной мысли, смысловая связь предложений. Допущено не более 1 недочета в содержании | Работа отличается богатством словаря и разнообразием используемых языковых средств, точностью, логичностью, уместностью, выразительностью, единством использования языковых средств. Допущено не более 1 речевого недочета | 0/2, 1/1, 1/0, 0/1 или 1–3 исправления на месте орфограмм (пунктограмм) при 0–1 грамматической ошибке |
| 10. | 10 (десять) | Работа полностью раскрывает тему и основную мысль (наличие тематического единства). Соблюдается последовательность развития мысли, выдерживаются смысловая цельность в развертывании основной мысли, смысловая связь предложений. Недочетов в содержании не допущено | Работа отличается богатством словаря и разнообразием используемых языковых средств, точностью, логичностью, уместностью, выразительностью. Речевые недочеты отсутствуют | 0/0, 1(негрубая)/0, 0/1 (негрубая), 1–2 исправления не на месте орфограмм (пунктограмм) |

3.3 Крытэрыі ацэнкі творчага субяседавання

| Балы (0–10) | Аналіз творчых работ абітурыента (заданне 1) | Адказ на пытанні (заданне 2) | Пісьмовае заданне па рэдагаванні тэкстаў (заданне 3) |
|---|---|---|---|
| Дзесяць балаў (“10”) | Абітурыент мае апублікаваныя ці агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 10. Матэрыялы падрыхтаваны ў рознай жанравай форме, пераважна аналітычныя. Матэрыялы апублікаваны ці прагучалі ў эфіры рэспубліканскіх або абласных СМІ. Матэрыялы атрымалі ўзнагароду на рэспубліканскім этапе прафесійнага творчага конкурсу па журналістыцы. | Абітурыент паказаў глыбокія веды і даў поўны адказ на пытанне. Граматна (лагічна, стылістычна) пабудаваў адказ. Дакладна выкарыстоўваў тэрміналогію СМІ. Прадэманстраваў здольнасць самастойна і творча мысліць. Адказаў на дадатковыя пытанні. | Абітурыент прааналізаваў граматычную структуру тэкстаў, выправіў памылкі, тэарэтычна абгрунтаваў праўку. |
| Дзевяць балаў (“9”) | Абітурыент мае апублікаваныя ці агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 10. Матэрыялы падрыхтаваны ў рознай жанравай форме, пераважна аналітычныя. Матэрыялы апублікаваны ці прагучалі ў эфіры рэспубліканскіх або рэгіянальных СМІ. | Абітурыент паказаў выдатныя веды і даў поўны адказ на пытанне. Граматна (лагічна, стылістычна) пабудаваў адказ. Дакладна выкарыстоўваў тэрміналогію СМІ. Прадэманстраваў здольнасць самастойна і творча мысліць. Адказаў на дадатковыя пытанні. | Абітурыент прааналізаваў граматычную структуру тэкстаў, выправіў памылкі, тэарэтычна абгрунтаваў праўку. |
| Восем балаў | Абітурыент мае апублікаваныя ці | Абітурыент прадэманстраваў | Абітурыент прааналізаваў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| (“8”) | агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 10. Матэрыялы падрыхтаваны ў рознай жанравай форме, маюць месца аналітычныя жанры. | добрыя веды, не дапусціў у адказе істотных недаклад-насцей, правільна выкарыстоўваў тэрміналогію СМІ. Стылістычна граматна, лагічна правільна пабудаваў адказ. Выявіў здольнасць да самастойнага мыслення. Адказаў на дадатковыя пытанні. | граматычную структуру тэкстаў, выправіў памылкі, але не здолеў у некаторых выпадках тэарэтычна абгрунтаваць праўку. |
| Сем балаў (“7”) | Абітурыент мае апублікаваныя ці агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 7. Матэрыялы падрыхтаваны ў рознай жанравай форме, маюць месца аналітычныя жанры. | Абітурыент прадэманстраваў добрыя веды, не дапусціў у адказе істотных недакладнасцей, правільна выкарыстоўваў тэрміналогію СМІ. Стылістычна граматна, лагічна правільна пабудаваў адказ. Выявіў здольнасць да самастойнага мыслення. Адказаў на дадатковыя пытанні. | Абітурыент прааналізаваў граматычную структуру тэкстаў, выправіў памылкі, але не здолеў у некаторых выпадках тэарэтычна абгрунтаваць праўку. |
| Шэсць балаў (“6”) | Абітурыент мае апублікаваныя ці агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 7. Матэрыялы падрыхтаваны ў інфармацыйных жанрах. Матэрыялы апублікаваны ці прагучалі ў эфіры пераважна мясцовых СМІ. | Абітурыент дапусціў пры адказе некаторыя недакладнасці, не заўсёды правільна выкарыстоўваў тэрміналогію СМІ. Абітурыент здольны самастойна вырашаць толькі тыповыя задачы. Дапусціў недакладнасці пры адказе на дадатковыя пытанні. | Абітурыент прааналізаваў тэксты, выправіў памылкі, але не здолеў тэарэтычна абгрунтаваць праўку. |
| Пяць | Абітурыент мае | Абітурыент | Абітурыент |

| | | | |
|---|---|---|---|
| балаў (“5”) | апублікаваныя ці агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 5. Матэрыялы падрыхтаваны ў інфармацыйных жанрах. Матэрыялы апублікаваны ці прагучалі ў эфіры пераважна мясцовых СМІ. | прадэманстраваў здавальняючыя веды, дапусціў пры адказе недакладнасці, не заўсёды правільна выкарыстоўваў тэрміналогію СМІ. Стыль і логіка адказу на пытанне шаблонныя. Абітурыент здольны самастойна вырашаць толькі тыповыя задачы. Дапусціў недакладнасці пры адказе на дадатковыя пытанні. | прааналізаваў тэксты, але не заўважыў некаторыя памылкі і/ці не здолеў тэарэтычна абгрунтаваць праўку.<br><br>**ці**<br><br>Абітурыент прааналізаваў толькі адзін тэкст (рускамоўны ці беларускамоўны), выправіў памылкі і тэарэтычна абгрунтаваў праўку. |
| Чатыры балы (“4”) | Абітурыент мае апублікаваныя ці агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 5. Матэрыялы падрыхтаваны ў інфармацыйных жанрах. Матэрыялы апублікаваны ці прагучалі ў эфіры мясцовых СМІ. | Абітурыент прадэманстраваў здавальняючыя веды, дапусціў пры адказе істотныя недакладнасці, не заўсёды правільна выкарыстоўваў тэрміналогію СМІ. Стыль і логіка адказу стандартныя. Абітурыент здольны самастойна вырашаць толькі тыповыя задачы. Дапусціў недакладнасці пры адказе на дадатковыя пытанні. | Абітурыент прааналізаваў тэксты, але не заўважыў істотных тэкставых памылак.<br><br>**ці**<br><br>Абітурыент прааналізаваў толькі адзін тэкст (рускамоўны ці беларускамоўны), выправіў памылкі, але ў некаторых выпадках не здолеў тэарэтычна абгрунтаваць праўку. |
| Тры балы (“3”) | Абітурыент мае апублікаваныя ці агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 3. Матэрыялы падрыхтаваны ў інфармацыйных жанрах. Матэрыялы апублікаваны ці прагучалі ў эфіры | Абітурыент прадэманстраваў здавальняючыя веды, дапусціў пры адказе некаторыя недакладнасці, не заўсёды правільна выкарыстоўваў тэрміналогію СМІ. Стыль і логіка адказу на пытанне шаблонныя. Абітурыент самастойна | Абітурыент прааналізаваў тэксты, не заўважыў істотных памылак.<br><br>**ці**<br><br>Абітурыент прааналізаваў толькі адзін тэкст (рускамоўны ці беларускамоўны), |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | мясцовых СМІ. | здольны вырашаць толькі тыповыя задачы. Не змог адказаць на дадатковыя пытанні. | выправіў памылкі, але не здолеў тэарэтычна абгрунтаваць праўку. |
| Два балы (“2”) | Абітурыент мае неапублікаваныя ці не агучаныя ў эфіры журналісцкія матэрыялы – не менш за 3. | Адказ абітурыента не адпавядае сутнасці змешчанага ў экзаменацыйным заданні пытання. | Абітурыент дапусціў памылкі пры аналізе тэкстаў. |
| Адзін бал (“1”) | Абітурыент мае адзіны неапублікаваны ці не агучаны ў эфіры журналісцкі матэрыял. | Адказ абітурыента не адпавядае сутнасці змешчанага ў экзаменацыйным заданні пытання. | Заданне не выканана. |
| Нуль балаў (“0”) | Публікацыі адсутнічаюць. | Абітурыент на пытанні не адказаў. | Заданне не выканана. |

**Узгоднена**

Першы прарэктар
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта

___________ Д.М.Курловіч
“____”______________2023